ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 20 (192) | Субота, 1 чэрвеня 1974 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

**У КПСС няма іншых інтарэсаў, акрамя інтарэсаў народа, няма іншай мэты, акрамя шчасця і дабрабыту працоўных. Савецкія людзі давяраюць сваёй партыі, і партыя робіць усё, каб быць вартай гэтага давер'я. Абапіраючыся на падтрымку мас, яна ўпэўнена вядзе народ да новых перамог у імя перамогі гістарычнай справы, завешчанай вялікім Леніным, у імя перамогі камунізму.**

(Са Звароту ЦК КПСС да ўсіх выбаршчыкаў, грамадзян СССР).

КАНДЫДАТЫ НАРОДА

## СМІРНОЎ Аляксей Аляксеевіч



### КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР ПА ГОМЕЛЬСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ № 84 ПА ВЫБАРАХ У САВЕТ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

Тав. Смірноў Аляксей Аляксеевіч нарадзіўся ў 1921 годзе ў вёсцы Кулеміха Ветлужскага раёна Горкаўскай вобласці, рускі, член КПСС з 1947 года. Пасля заканчэння школы ў 1938 годзе ён паступіў у Маскоўскі горны інстытут, вучоба ў якім перапынілася ў сувязі з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. У 1941 годзе пайшоў на фронт і быў намеснікам палітрука роты 901-га стралковага палка Паўночна-Заходняга фронту, у 1942 годзе атрымаў раненне і пасля лячэння ў шпіталі працягваў вучобу ў горным інстытуце ў г. Караганда. У 1944 годзе пачаў працаваць інжынерам-праекціроўшчыкам трэста «Чысцякоўантрацыт» у горадзе Чысцякове.

У 1946 годзе выбран першым сакратаром Днепрапятроўскага гаркома камсамола, дзе працаваў да 1949 года. У 1949 годзе быў выбран першым сакратаром Днепрапятроўскага абкома камсамола. З 1951 да 1954 года працаваў намеснікам загадчыка аддзела ЦК ВЛКСМ, з 1954 года знаходзіцца на партыйнай рабоце, адразу — інструктар аддзела парторганаў ЦК КПСС па саюзных рэспубліках, затым — загадчык аддзела ЦК КПБ. У 1959 годзе быў выбран першым сакратаром Брэсцкага абкома КП Беларусі, а ў 1965 годзе — сакратаром ЦК КПБ.

Тав. Смірноў А. А. з'яўляецца членам бюро ЦК КПБ, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

Тав. Смірноў А. А. узнагароджан ордэнам Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцягу, Славы III ступені, двума ордэнамі «Знак Пашаны» і шасцю медалямі.

## КАВАЛЁЎ Пётр Купрыянавіч



### КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР ПА ГОМЕЛЬСКАЙ ГАРАДСКОЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ № 582 ПА ВЫБАРАХ У САВЕТ САЮЗА

Тав. Кавалёў Пётр Купрыянавіч нарадзіўся ў 1931 годзе ў вёсцы Заоалоцце Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці, беларус, член КПСС з 1956 года, адукацыя сярэдняя.

Тав. Кавалёў П. К. сваю працоўную дзейнасць пачаў у 1945 годзе ў калгасе «Іскра» Буда-Кашалёўскага раёна. У 1947 годзе пайшоў вучыцца ў школу фабрычна-заводскага навучання № 56 у горадзе Гомелі, якую закончыў у 1949 годзе, затым быў накіраваны на работу шафёрам на Мінскі трактарны завод. З 1950 па 1951 год працаваў слесарам-мантажнікам гэтага ж завода.

У 1951 годзе быў прызваны на службу ў ваенна-марскі флот. Дэмабілізаваўшыся, тав. Кавалёў П. К. прыехаў у Гомель і пачаў працаваць на заводзе «Гомсельмаш», адразу машыністам-турбіністам энергапоезда, а з 1958 года па цяперашні час — слесарам па рамонту абсталявання інструментальнага цэха.

Тав. Кавалёў П. К. узнагароджан ордэнам Леніна і ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцягу, медалем «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна».

**ТАВАРЫШЫ ВЫБАРШЧЫКІ! У ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ — 16 ЧЭРВЕНЯ 1974 ГОДА — УСЕ, ЯК АДЗІН, АДДАДЗІМ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА ДАСТОЙНЫХ КАНДЫДАТАЎ НЕПАРУШНАГА БЛОКУ КАМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ АЛЯКСЕЯ АЛЯКСЕЕВІЧА СМІРНОВА І ПЯТРА КУПРЫЯНАВІЧА КАВАЛЁВА.**

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

Вучэбна-выхаваўчая работа — адна з важнейшых у падрыхтоўцы маладых спецыялістаў. Яна заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі рэктарата. Не выпадкова на чарговым пасяджэнні Вучонага савета ўніверсітэта, якое адбылося 30 мая, першым на парадку дня стаяла пытанне «Аб стане вучэбна-выхаваўчай работы на факультэце фізічнага выхавання». Заслуханы даклад дэкана гэтага факультэта Б. М. Зайцава, які адначасова са станоўчым вымушаны быў гаварыць і аб істотных недахопах, маючых месца ў арганізацыі вучэбнага і выхаваўчага працэсу.

Прабелы ў важнай справе зазначылі і выступіўшыя ў спрэчках. Вучоны савет прыняў пастанову, накіраваную на паляпшэнне вучэбна-выхаваўчай работы на факультэце фізвыхавання.

Затым былі разгледжаны вынікі выканання плана мерапрыемстваў па арганізацыі прыёму студэнтаў на 1974-75 навучальны год. Па гэтаму пытанню заслухана паведамленне адказнага сакратара прыёмнай камісіі, дацэнта І. П. Трацэўскага.

Сур'ёзная размова адбылася пры абмеркаванні пытання аб выкарыстанні ЭВМ у распрацоўцы аўтаматызаванай інфармацыйна-кіруючай сістэмы вышэйшай школы (АІС ВШ). Даклад зрабіў загадчык кафедры вылічальных машын і праграмавання, дацэнт В. Е. Быхаўцаў.

Вучоны савет правёў перавыбранне і выбранне на вакантныя пасады прафесарска-выкладчыцкага саставу.

## У МЯСЦКОМЕ

28 мая адбылося пашыранае пасяджэнне мясцкома з удзелам старшынь прафбюро і прафгрупоргаў падраздзяленняў універсітэта.

Заслухана і абмеркавана пытанне аб рэалізацыі прапаноў і крытычных заўваг членаў прафсаюза на агульных сходах падраздзяленняў універсітэта (дакладвалі — старшыня вытворча-масавай камісіі прафесар А. С. Калугін, старшыня жыллёва-бытавой камісіі І. М. Палій, старшыня культурна-масавай і спартыўна-масавай камісіі Н. І. Перхунова і старшыня камісіі па ахове працы і тэхніцы бяспекі дацэнт Ю. Ф. Хадакоўскі).

Заслухалі таксама справаздачы. Старшыні прафбюро механіка-матэматычнага і фізічнага факультэтаў В. В. Мухін і М. Т. Баранаў давалі іх аб ходзе выканання сацыялістычных абавязацельстваў на 1974 год.

Старшыні прафбюро і прафгрупоргі інфармавалі мясцком аб ходзе выканання плана збору членскіх прафсаюзных узносаў за 2-гі квартал гэтага года.

Па ўсіх абмеркаваных пытаннях прыняты адпаведныя рашэнні.

## НА ДЗЯРЖАЎНЫХ ЭКЗАМЕНАХ

Сёння для студэнтаў — гарачая пара. Асабліва шмат хваляванняў прыносяць дзяржаўныя экзамены, якія здаюць пяцікурснікі. Студэнты-філолагі ўжо здалі экзамен па навуковаму камунізму. Ён быў апошнім для тых, у каго наперадзе засталася абарона дыпломных работ.

Сёлета ў нашым універсітэце — першы выпуск гісторыкаў. Гэтую спецыяльнасць набылі 45 юнакоў і дзяўчат. Яны здалі дзяржаўныя экзамены па гісторыі КПСС. Глыбокія веды паказалі студэнты В. Вайцянок, У. Марачкін, М. Старавойтаў, А. Шаюнова, В. Панамарэнка, Л. Маёрава, У. Лазавікоў, Л. Калач, У. Гладышаў, В. Бай, Л. Вайцянок. Усе яны атрымалі пяцёркі.

## УСЕСАЮЗНЫ ПАХОД КЛІЧА

Днямі адбылося пасяджэнне камітэта камсамола, прафкома і камітэта ДТСААФ універсітэта, на якім абмеркавана пытанне ходу выканання сумесных мерапрыемстваў Усесаюзнага паходу камсамольцаў і моладзі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа, прысвечанага 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна і 30-годдзю перамогі Савецкага Саюза над гітлераўскай Германіяй. Вызначаны напрамкі далейшай работы грамадскіх арганізацый і факультэтаў універсітэта. Асаблівая ўвага звернута на распрацоўку заданняў для пярвічных студэнцкіх камсамольскіх арганізацый і арганізацыі супрацоўнікаў універсітэта, а таксама будатрадаў для ўдзелу іх ва Усесаюзным паходзе.

**П. ЖУКАЎ,**
**старшыня камітэта ДТСААФ.**

*Насустрач трэццяму, працоўнаму*

## ПА МЕТАДУ ЗЛОБІНА

Хутка ў студэнтаў закончыцца другі вучэбны семестр і паклічуць іх дарогі ў розныя кірункі. Адны будуць адпачываць, другія —праходзіць практыку, а для многіх пачнецца працоўны семестр.

У мінулым годзе студэнцкі будаўнічы атрад «Універсал-73» нашага ўніверсітэта, у які ўвайшлі слухачы падрыхтоўчага аддзялення, працаваў у арганізацыі міжкалгасбуда Буда-Кашалёўскага раёна. Сёлета амаль у ранейшым саставе студэнты першага курса гісторыка-філалагічнага факультэта зноў паедуць у гэты раён.

Рабятам падабаецца работа будаўнікоў. Летась іхні атрад заняў першае месца ў вобласці па арганізацыях міжкалгасбуда і яму быў уручаны пераходны Чырвоны Сцяг.

Сёлета штаб СБА пры абкоме камсамола прапанаваў байцам «Універсала-74» працаваць па метаду М. Злобіна. Камандзір атрада, камуніст Уладзімір Басак гаворыць: «Мы абавязаліся за сорак каляндарных дзён, замест шасці месяцаў па норме, пабудаваць механізаваную майстэрню ў калгасе імя Ульянава. Думаю, што са сваімі слаўнымі рабятамі мы выканаем свае абавязацельствы і апраўдаем давер'е камсамольцаў Гомельшчыны».

Сапраўды гэта вялікае заданне, якое ўзялі на сябе байцы «Універсала-74». Трэба скараціць больш чым у чатыры разы тэрмін узвядзення аб'екта. Але хлопцы не падвядуць. Сярод 25 байцоў — 5 камуністаў, многія ўжо працавалі на будаўнічых пляцоўках. Абавязкі повара будзе выконваць Алег Сяргеенка. Гэтую спецыяльнасць ён набыў праходзячы службу ў радах Савецкай Арміі. Урач атрада — Уладзімір Сіманенка. Да паступлення ва ўніверсітэт ён закончыў медыцынскае вучылішча.

**А. АЛЕСЕЎ,**
**наш кар.**

# ГОСЦЬ УНІВЕРСІТЭТА— ПРЭЗІДЭНТ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

Кандыдатам у дэпутаты Савета Саюза Вярхоўнага Савета СССР па Гомельскай сельскай выбарчай акрузе вылучаны відны вучоны, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, прэзідэнт Акадэміі навук Беларускай ССР, член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР М. А. Барысевіч. У час прыезду ў Гомель для сустрэчы са сваімі выбаршчыкамі Мікалай Аляксандравіч наведаў наш універсітэт.

Прэзідэнт Акадэміі праявіў вялікую цікавасць да вядучай вышэйшай навучальнай установы беларускага Палесся. Разам з сакратаром Гомельскага абкома КПБ А. І. Жыльскім ён агледзеў вучэбныя карпусы, лабараторыі, вёў гутаркі ў дэканатах, на кафедрах, з супрацоўнікамі ГДУ.



Мікалай Аляксандравіч Барысевіч глыбока ўнікаў ва ўсе сферы дзейнасці ўніверсітэта. Укамплектаванасць навуковымі кадрамі і тэхнічная аснашчанасць, стан навукова-даследчай працы прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнцтва— гэтыя і многія іншыя пытанні не засталіся па-за ўвагай прэзідэнта.

Найбольш за ўсё высокага госця цікавілі праблемы развіцця ва ўніверсітэце фундаментальных навуковых даследаванняў, якія б мелі вялікае прыкладное значэнне, з поспехам укараняліся ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Для гэтага акадэмік даў шэраг каштоўных парад, выказаў гатоўнасць аказаць універсітэту пэўную дапамогу ў вырашэнні важнейшых задач і наладжвання супрацоўніцтва з акадэмічнымі навукова-даследчымі інстытутамі.



На фізічным факультэце М. А. Барысевіч першым пакінуў свой подпіс у адной з лабараторый для памяці аб наведванні ўніверсітэта. Гэты пачатак паслужыць добрай традыцыі: свае аўтографы на сцяне, якія пакрыюцца лакам, цяпер будуць пакідаць усе ганаровыя госці ГДУ.

**На здымках:** 1. У лабараторыі фізічнага факультэта. Аб праводзімым навуковым даследаванні растлумачвае кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Г. В. Старыкава. 2. Фотаздымак аб памятнай сустрэчы. Справа — прэзідэнт Акадэміі навук БССР М. А. Барысевіч.

Фота **А. Рудчанкі.**

*НА АГУЛЬНАЎНІВЕРСІТЭЦКІМ ПАРТЫЙНЫМ СХОДЗЕ*

# ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА КАМУНІСТАЎ

У мінулую сераду адбыўся адкрыты агульнаўніверсітэцкі партыйны сход. Камуністы абмеркавалі пытанне «Аб далейшым павышэнні дзейснасці ідэйна-палітычнай работы ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС і XIII пленума ЦК КПБ».

ДАКЛАДЧЫК, сакратар парткома **У. В. Казлоў,** адзначыў, што XIII пленум Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі, які праходзіў 29—30 красавіка г. г., усебакова і патрабавальна прааналізаваў дзейнасць партыйных арганізацый рэспублікі па камуністычнаму выхаванню працоўных. На ім ішла глыбокая размова аб тым, як забяспечыць высокую эфектыўнасць ідэйна-палітычнай работы, умацаваць яе сувязь з вытворчасцю. Гэты аналіз прама і непасрэдна адносіцца і да партыйнай арганізацыі, усяго калектыву нашага ўніверсітэта.

У. В. Казлоў у сваім дакладзе гаворыць аб дасягненнях у станаўленні ўніверсітэта, вырашэнні пастаўленых партыяй і ўрадам задач па далейшаму ўдасканальванню вышэйшай адукацыі. Сведчаннем некаторых нашых поспехаў з'яўляецца высокі працэнт паспяховасці студэнтаў, рост навукова-даследчай работы, павелічэнне аб'ёму гаспадарча-дагаворных тэм. Аднак, як паказалі лічбы аналізу, уклад факультэтаў і кафедр у гэту справу далёка не аднолькавы. Слаба выкарыстоўваюць свае патэнцыяльныя магчымасці для вядзення гаспадарча-дагаворных распрацовак біёлага-глебавы і эканамічны факультэты, а таксама кафедры грамадскіх навук.

Партыйны камітэт і рэктарат занепакоены становішчам з выкананнем гаспдагаворных тэм і на кафедры агульнай геалогіі, якую ўзначальвае прафесар С. Д. Туроўскі.

На пленуме ЦК КПБ вялікая ўвага была ўдзелена пытанням прапаганды эканамічных ведаў, арганізацыі эканамічнай вучобы нашых кадраў. У гэтай справе ва ўніверсітэце маецца станоўчы вопыт. Па ініцыятыве вучоных эканамічнага факультэта і кафедры палітэканоміі ў горадзе былі арганізаваны «Дні навукі», праводзіліся сустрэчы «Эканаміст за круглым сталом» і іншыя цікавыя мерапрыемствы. Гэта ініцыятыва была адобрана на бюро гаркома партыі, на яе актыўна адклікнуліся вучоныя іншых кафедр. Аднак цяпер у лекцыйнай прапагандзе, адзначае У. В. Казлоў, назіраецца прыкметны спад. Недастаткова актыўна вядзецца лекцыйная прапаганда па тэматыцы, прысвечанай 30-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У гэтай справе яшчэ многае належыць зрабіць універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды» (старшыня Л. М. Гаранін).

Абавязак кожнага ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны дапамагчы партыйным арганізацыям, камітэту камсамола ў ваенна-патрыятычным выхаванні нашай моладзі. Пра тое, што мы можам гэта рабіць на высокім ідэйным і мастацкім узроўні, засведчыў вечар, які быў праведзены ва ўніверсітэце ў гонар Дня Перамогі.

На ўсіх культурна-масавых мерапрыемствах павінна як мага больш быць і нашых выкладчыкаў. У дакладзе названы прозвішчы дэканаў, іх намеснікаў, загадчыкаў кафедр т.т. Хадакоўскага, Старыкава, Прыходзькі, Аміравай, Балакіна, Паламарчука, Бекарэвіча, Стаўрова і іншых, якія амаль ніколі не наведваюць урачыстых вечароў і іншых мерапрыемстваў, праводзімых ва ўніверсітэце.

Дакладчык далей засяроджвае ўвагу камуністаў на насцярожваючых фактах абыякавых адносін асобных студэнтаў да грамадскіх навук. У гэтым бачны і нашы ўпушчэнні ў палітыка-выхаваўчай рабоце са студэнтамі, у адборы абітурыентаў і індывідуальнай рабоце з імі.

У гэтай справе важная роля надаецца куратарам студэнцкіх груп. Аднак многія з іх адносяцца да сваіх абавязкаў без пачуцця высокай адказнасці. Пацвярджэннем гэтаму можа быць той факт, што палавіна з іх нават не з'явілася на семінар куратараў, які праводзіўся парткомам у першым вучэбным семестры і па свайму зместу быў даволі карысным.

СЁННЯШНІ студэнт — гэта заўтрашні спецыяліст, кіраўнік калектыву, арганізатар вытворчасці. Яго адпаведнасць тым задачам, якія ён павінен вырашаць, залежыць ад сённяшняй нашай работы па выпрацоўцы ў яго тых якасцей савецкага спецыяліста, пра якія сказаў таварыш Л. І. Брэжнеў у прамове на Ўсесаюзным злёце студэнтаў.

На жаль, зазначыў дакладчык, нягледзячы на параўнальна высокую паспяховасць па грамадскіх навуках, мы не можам гаварыць аб поўным адзінстве ведаў і перакананняў нашых студэнтаў. Нас трывожыць яшчэ значная колькасць амаральных учынкаў. Па гэтай прычыне з універсітэта выключана ў гэтым навучальным годзе сем студэнтаў. Сярод іх — студэнтка 5-га курса біёлага-глебавага факультэта Паперная, якая на працягу некалькіх год крала грошы ў сваіх сябровак.

У. В. Казлоў гаворыць аб тым, што мы не дабіліся яшчэ таго, каб кожны амаральны ўчынак стаў вядомым шырокай масе студэнцтва і знайшоў усеагульнае асуджэнне.

Партыйны камітэт асабліва ўстрывожаны становішчам спраў на факультэце фізвыхавання. У гэтым навучальным годзе пяць яго студэнтаў выключаны з універсітэта за амаральныя ўчынкі. Партбюро, дэканат факультэта яшчэ па-сапраўднаму не займаюцца ідэйна-выхаваўчай работай і, горш таго, іншы раз выступаюць у ролі заступнікаў тых, да каго трэба прымаць самыя суровыя меры ўздзеяння. Тут на трэці курс прынялі Баравікова, які ў маі 1973 года быў выключаны за сістэматычнае п'янства, хуліганства і пападанне ў выцвярэзнік. Адзінаццаць месяцаў па-за сценамі ўніверсітэта Баравікоў правёў таксама не лепшым чынам.

У дакладзе прыводзіліся і іншыя факты, якія сведчаць аб нездавальняючым узроўні ідэйна-выхаваўчай работы на факультэце фізвыхавання.

Затым дакладчык гаворыць аб павышэнні эфектыўнасці партыйнай адукацыі. Адначасова са станоўчымі момантамі У. В. Казлоў указвае на тое, што асобныя выкладчыкі, такія як С. П. Емяльянава, Л. К. Нярonская і іншыя амаль не наведваюць заняткі ў вячэрнім універсітэце марксізму-ленінізму.

Асаблівую ўвагу У. В. Казлоў звяртае на пытанне падрыхтоўкі ўступаючых у рады Камуністычнай партыі, на падбор кадраў для працы ва ўніверсітэце. Выказваецца думка перад перавыбраннем на наступны тэрмін заслухоўваць справаздачу выбіраемага не толькі аб сваёй рабоце, але і аб асабістым ідэйна-палітычным узроўні.

Прадметам вялікіх клопатаў рэктарата, парткома, камітэта камсамола, прафсаюза з'яўляецца работа факультэта грамадскіх прафесій. У яго сістэме добра працуе «Школа маладога лектара», у шасці секцыях якой займаецца больш 200 студэнтаў. Кіраўнік школы Э. М. Энцін, а таксама кіраўнікі секцый Т. П. Гараніна, Л. М. Гаранін, Я. В. Яршоў-Мазураў, камітэт камсамола робяць нямала для таго, каб адсюль выходзілі добра падрыхтаваныя маладыя лектары.

У ідэйна-выхаваўчай рабоце студэнтаў значная роля адводзіцца мастацкай самадзейнасці. Аднак пакуль што толькі радуе вакальна-інструментальны ансамбль «Радзімічы» , а астатнія калектывы ўсё яшчэ на шляху станаўлення ці наогул распаліся. Час патрабуе карэнным чынам змяніць адносіны да гэтага важнага сродка ідэйнага, маральнага і эстэтычнага выхавання моладзі.

Многае трэба зрабіць ва ўніверсітэце і для паляпшэння нагляднай агітацыі.

У дакладзе дадзена ацэнка і шматтыражнай газеце «Гомельскі ўніверсітэт». Разам з яе вартасцямі адзначаны і недахопы. У прыватнасці, указана на тое, што на старонках газеты вельмі мала публікуецца крытычных матэрыялаў, не сканцэнтроўваецца ўвага чытачоў на сур'ёзных праблемах.

У канцы свайго даклада У. В. Казлоў спыніўся на пытанні актыўнай падрыхтоўкі і ўзорнага правядзення выбараў у Вярхоўны Савет СССР.

У СПРЭЧКАХ па дакладу выступілі дзевяць камуністаў. Аб павышэнні ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню навуковых даследаванняў і іх эфектыўнасці гаварыў прарэктар па навукова-даследчай рабоце прафесар **М. В. Навучыцель.** Міхаіл Веніямінавіч закрануў таксама пытанні планавання і выканання індывідуальных планаў, больш сур'ёзнага падыходу да выбару навуковых тэм, паставіў задачу далейшага ўдасканальвання і паляпшэння работы студэнцкага навуковага таварыства.

Дэкан эканамічнага факультэта, дацэнт **І. П. Трацэўскі** расказаў аб вопыце ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў на сваім факультэце, адзначыў значэнне павышэння грамадскай актыўнасці студэнтаў, стварэння для іх нармальных жыллёвых і бытавых умоў, назваў прозвішчы тых выкладчыкаў, якія шмат працуюць на ніве выхавання будучых маладых спецыялістаў.

Сакратар партбюро фізічнага факультэта **Т. П. Жалонкіна** ў сваім выступленні гаварыла аб кіраўніцтве партыйнай арганізацыяй, камсамолам, рабоце камуністаў і выкладчыкаў у інтэрнатах.

Павышэнню ўзроўню і паглыбленню навуковых даследаванняў, удасканальванню работы з першакурснікамі прысвяціў сваё выступленне член-карэспандэнт АПН СССР **І. Ф. Харламаў.**

Старшыня ўніверсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды», дацэнт Л. М. Гаранін падзяліўся думкамі аб тым, што намячаецца зрабіць, каб ужо ў бліжэйшы час актывізаваць лекцыйную прапаганду сярод студэнтаў, працоўных горада і вобласці па самых актуальных тэмах.

З вялікай увагай было заслухана выступленне рэктара, доктара фізіка-матэматычных навук Б. В. Бокуця, які закрануў самыя важныя пытанні, якія належыць вырашаць універсітэцкаму калектыву ў цяперашні перыяд. Барыс Васільевіч расказаў пра сустрэчу ў ГДУ з прэзідэнтам АН БССР, акадэмікам М. А. Барысевічам, пра тое, якімі шляхамі будуць развівацца навуковыя даследаванні ва ўніверсітэце, як прадугледжваецца ажыццяўляць падрыхтоўку кадраў для народнай гаспадаркі і для працы ў вышэйшай школе.

На партыйным сходзе выступілі таксама старшыня культурна-масавай камісіі мясцкома **Н. І. Перхунова,** студэнт чацвёртага курса гісторыка-філалагічнага факультэта **М. І. Бойка,** сакратар камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў універсітэта **В. М. Навуменка.**

Партыйны сход прыняў разгорнутую пастанову, накіраваную на далейшае павышэнне дзейснасці ідэйна-палітычнай работы ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС і XIII пленума ЦК КПБ.

СТАРОНКА ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

# НА ВУЧОБУ ЗАПРАШАЕ ФАКУЛЬТЭТ ФІЗВЫХАВАННЯ

## КУЗНЯ ФІЗКУЛЬТУРНЫХ КАДРАЎ

Сёлета нашаму факультэту споўнілася 25 гадоў. Цяпер яго выпускнікоў можна сустрэць у многіх школах, прафесіянальна-тэхнічных вучылішчах, у вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах, на вытворчасці і кіруючых пасадах у фізкультурных арганізацыях. Так, Я. Верцелеў працуе начальнікам упраўлення Міністэрства ўнутраных спраў СССР, А. Царык—начальнікам водных відаў спорту Спорткамітэта пры Савеце Міністраў СССР, В. Бяляўскі — загадчыкам кафедры фізвыхавання БІІЧТу, А. Сямікоп — загадчыкам кафедры спартыўных гульняў і гімнастыкі нашага факультэта, а І. Будзюхін — загадчыкам кафедры фізічнага выхавання ўніверсітэта.

На нашым факультэце атрымалі вышэйшую адукацыю многія вядомыя спартсмены, якія праславілі Радзіму выдатнымі спартыўнымі дасягненнямі. Гэта — чэмпіён Алімпійскіх гульняў, неаднаразовы пераможца першынстваў свету, Еўропы і Савецкага Саюза па веславанню Л. Гейштар, уладальнік кубка Еўропы па спрынтарскаму бегу В. Сапея, чэмпіён Еўропы А. Маркаўцаў, адзін з мацнейшых бегуноў кантынента на 400-метровай дыстанцыі з перашкодамі, удзельнік Алімпійскіх гульняў Я. Гаўрыленка, чэмпіёны СССР В. Паўлючкоў, В. Харытонаў і многія іншыя.

Цяпер сярод выхаванцаў нашага факультэта 16 майстроў і 43 кандыдаты ў майстры спорту, 203 першаразраднікі. Вучэбны працэс ажыццяўляюць супрацоўнікі чатырох кафедр — спартыўных гульняў і гімнастыкі, тэарэтычных асноў фізічнага выхавання і плавання, лёгкай атлетыкі, фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны. У нас працуюць выкладчыкі вы сокай кваліфікацыі. Сярод іх — доктар медыцынскіх навук, прафесар, 6 кандыдатаў навук, заслужаны майстар і 15 майстроў спорту СССР, 4 выдатнікі фізічнай культуры, 4 заслужаныя трэнеры БССР, 3 суддзі Усесаюзнай катэгорыі і 10 — Рэспубліканскай.

Наш факультэт кожны год дабіваецца высокіх спартыўных дасягненняў. Ён трывала займае другое месца, услед за ІФК, сярод вну Беларусі, быў прызнан лепшым у краіне на аглядзе-конкурсе па спартыўна-масавай рабоце.

Сёння мы ганарымся многімі сваімі выхаванцамі, такімі як Пётр Кулікоў, Ніна Гнідзіна, Уладзімір Якутовіч, Уладзімір Бесараб, Надзежда Болатава і іншымі лёгкаатлетамі, веслярамі, плыўцамі, гімнастамі, барцамі, якія выходзілі пераможцамі і станавіліся прызёрамі разнастайных буйных спаборніцтваў. У гэтым ёсць вынік плённай працы і прафесарска-выкладчыцкага саставу, які актыўна займаецца праблемай удасканальвання методыкі падрыхтоўкі спартсменаў вышэйшых разрадаў. Супрацоўнікі кафедр вядуць комплексныя педагагічныя і медыка-біялагічныя даследаванні на спартсменах. Асабліва вялікая ўвага ўдзяляецца пытанням гемадынамікі і рухальных якасцей спартсменаў, вывучэнне якіх ажыццяўляецца пад кіраўніцтвам доктара медыцынскіх навук, прафесара А. С. Калугіна.

Нашы студэнты паспяхова займаюцца тэхнічнай творчасцю. Летась пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка В. А. Падасінава яны сканструявалі тры апараты, якія атрымалі прызавыя месцы на ўніверсітэцкай выстаўцы.

Многія будучыя спецыялісты фізічнай культуры цяпер актыўна ўдзельнічаюць у рабоце студэнцкіх навуковых гурткоў. На сваім рахунку маюць каштоўныя навуковыя працы Л. Чарноў, А. Макееў, М. Бухараў, П. Далганаў, Л. Янковіч і іншыя студэнты факультэта. З навуковымі дакладамі яны выступаюць на канферэнцыях універсітэта і іншых вну краіны.

Вядучым спартсменам ГДУ ствараюцца самыя спрыяльныя ўмовы для павышэння спартыўнага майстэрства і паспяховай вучобы. Яны ў першую чаргу забяспечваюцца стыпендыяй і інтэрнатам, маюць магчымасць перайсці на індывідуальны план навучання, для іх пераносяцца тэрміны здачы залікаў і экзаменаў.

Адначасова з вывучэннем спецыяльных дысцыплін нашы студэнты атрымоўваюць добрую ідэйна-палітычную загартоўку. За чатыры гады вучобы яны могуць набыць і адну з грамадскіх прафесій. У нас нямала вялікіх аматараў музыкі, сцэны і іншых відаў мастацтва. Нашы студэнты ўмеюць весела і з карысцю правесці свой адпачынак. Яны ўдзельнічаюць у кожным канцэрце мастацкай самадзейнасці, спартыўнымі нумарамі прыносяць гледачам вялікае задавальненне.

Праз лічаныя дні краіна атрымае маладых спецыялістаў фізічнага выхавання нашага 21-га выпуску. На іх месца прыйдзе новае папаўненне. Мы хочам, каб яно было дастойным сваіх папярэднікаў. Не трэба думаць, што наш факультэт — «лёгкі». Тут таксама трэба шмат працаваць, каб глыбока авалодаць праграмнымі ведамі, дасягнуць высокай спартыўнай кваліфікацыі.

Наш факультэт — для добра падрыхтаваных, моцных, смелых, мужных юнакоў і дзяўчат. Калі ласка, да нас на вучобу!

**Б. ЗАЙЦАЎ,**
**дэкан факультэта.**



**НА ЗДЫМКУ: навуковы эксперымент праводзяць студэнты факультэта пад кіраўніцтвам доктара медыцынскіх навук, прафесара А. С. Калугіна (на пярэднім плане).**

## ЗМЕСТ

### УСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ ПА СПАРТЫЎНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ НА ДЗЁННАЕ І ЗАВОЧНАЕ АДДЗЯЛЕННІ ФАКУЛЬТЭТА

Паступаючыя на факультэт фізічнага выхавання здаюць уступныя экзамены па наступных прафіліруючых дысцыплінах:

Па спецыяльнасці (па выбранаму віду спорту) — лёгкая атлетыка, канькабежны спорт, футбол, валейбол, баскетбол, лыжны спорт, фехтаванне, хакей, барацьба класічная, ручны мяч, веславанне на каноэ і байдарках — па фізіцы (вусна), па хіміі (вусна), сачыненне.

**Уступны экзамен па лёгкай атлетыцы**

Экзамен па лёгкай атлетыцы праводзіцца ў адзін дзень па наступных відах:

**Мужчыны**

1. Бег 100 м.
2. Бег 1.500 м.
3. Скачок у вышыню.
4. Штурханне ядра (вага 7,257 кг).

**Жанчыны**

1. Бег 100 м.
2. Бег 800 м.
3. Скачок у вышыню.
4. Штурханне ядра (вага 4 кг.).

Ацэнка ўступнага экзамену па лёгкай атлетыцы выводзіцца па дзеючай міжнароднай табліцы ацэнкі вынікаў у лёгкаатлетычных спаборніцтвах па мнагаборствах (у ачках).

**Мужчыны**

«выдатна» — 1600 ачкоў;
«добра» — 1300 ачкоў;
«здавальняюча» — 1000 ачкоў.

**Жанчыны**

«выдатна» — 2100 ачкоў;
«добра» — 1800 ачкоў;
«здавальняюча» — 1500 ачкоў.

Патрабаванні для паступаючых на завочнае аддзяленне наступныя: для мужчын ва ўзросце да 35 гадоў і жанчын ва ўзросце да 30 гадоў захоўваюцца агульныя патрабаванні для паступаючых на факультэт.

Для мужчын старэй 35 гадоў устанаўліваюцца наступныя нарматывы ў ачках: «выдатна» — 1.300 ачкоў, «добра» — 1000 ачкоў, «здавальняюча» — 700 ачкоў.

Для жанчын старэй 30 гадоў устанаўліваюцца наступныя нарматывы ў ачках: «выдатна» — 1800 ачкоў, «добра» — 1500 ачкоў, «здавальняюча» — 1200 ачкоў.

**Уступны экзамен па гімнастыцы**

**Мужчыны**

1. Перакладзіна. З віса падцягванне (колькасць разоў) — 10 (выдатна), 8 (добра), 6 (здавальняюча).

2. Бруссі. Вугал ва ўпоры «90 градусаў у сек.». — Звыш 5 сек. (выдатна), 5 сек. (добра), 3 сек. (здавальняюча).

3. Акрабатыка. Адвольнае акрабатычнае практыкаванне, якое састаіць з 4—5 элементаў з уключэннем кувыркоў, пераваротаў, стоек 10,0 — 9,0; 8,9—8,0; 7,9—7,0.

4. +Адвольнае практыкаванне на адным з гімнастычных снарадаў (перакладзіна, бруссі), якое састаіць з 4—5 элементаў з уключэннем пад'ёму. 10,0—9,0; 8,9—8,0; 7,9—7,0.

5. +Скачок (казёл у даўжыню 135 см.). Скачок ногі ў бакі (у балах) 10,0—9,0; 8,9—8,0; 7,9—7,0.

**Жанчыны**

1. +Адвольныя практыкаванні на брусссях рознай вышыні, якія састаяць з 4—5 элементаў з уключэннем пад'ёму на верхнюю жэрдку 10,0—9,0; 8,9—8,0; 7,9—7,0.

2. Лазанне па канату з дапамогай рук і ног (у метрах) 5 м; 4м; 3 м.

3. +Акрабатыка. Адвольныя акрабатычныя практыкаванні, якія састаяць з 4—5 элементаў з уключэннем кувыркоў, пераваротаў, стоек, «маста» (у балах) 10,0—9,0; 8,9—8,0; 7,9—7,0.

4. Нахілы назад з седа прадольна на гімнастычнай скамейцы, з замацаванымі нагамі, рукі на пояс (колькасць разоў) 8, 5, 3.

5. Скачок (казёл у даўжыню — 110 см) ускок ва ўпор, прысеў і саскок прагнуўшыся (у балах) 10,0—9,0; 8,9—8,0; 7,9—7,0.

**Уступны экзамен па плаванню (мужчыны і жанчыны)**

Праплыць дыстанцыю 100 м на ацэнку «выдатна» адным з спартыўных спосабаў плавання, паказаўшы час III спартыўнага разраду з прыбаўленнем 30 сек, «добра» — адным з спартыўных спосабаў плавання без уліку часу, «здавальняюча» — адвольна без уліку часу.

**Заўвага:** Практыкаванні, адзначаныя +, ацэньваюцца па правілах спаборніцтваў па спартыўнай гімнастыцы з наступным пераводам ацэнкі з 10-бальнай у 5-бальную сістэму.

Агульная ацэнка выводзіцца па шкале 25—23 балы — выдатна, 22—18 балаў — добра, 17—15 балаў — здавальняюча.

## ПРАВАФЛАНГОВЫЯ САВЕЦКАГА СПОРТУ

**Аматарам лёгкай атлетыкі нашай рэспублікі добра вядома імя Уладзіміра Бесараба. Ён — адзін з мацнейшых марафонцаў Беларусі.**

**Першы вялікі поспех прыйшоў да Уладзіміра больш года таму назад, калі ён стаў пераможцам Усесаюзнага марафонскага прабегу і ўпершыню выканаў нарматыў майстра спорту СССР.**

**Летась і сёлета У. Бесараб удзельнічаў у прабегу Курган Славы — Плошча Перамогі (г. Мінск), прысвечаным Дню Перамогі і абодва разы стаў другім прызёрм гэтых буйных традыцыйных спаборніцтваў.**

**НА ЗДЫМКУ: студэнт факультэта фізвыхавання, майстар спорту СССР Уладзімір Бесараб у час здачы экзамена.**



Фота **А. Рудчанкі.**

## СЛОВА ПРА ТАВАРЫША

Гады вучобы ў вышэйшай навучальнай установе для кожнага юнака і дзяўчыны самыя памятныя. Ты набываеш не толькі любімую спецыяльнасць, але і добрых і верных сяброў.

Сярод чацвёртакурснікаў, ды і ўсіх студэнтаў факультэта, вялікім аўтарытэтам карыстаецца Мікалай Бухараў. Таварышы адносяцца да яго з павагай і любоўю, бо ў ім увасобіліся лепшыя рысы, якія характэрны для нашага маладога сучасніка.

З першага курса Мікалай займаецца толькі на «выдатна». Вучобу ён паспяхова сумяшчае з навукова-даследчай працай на кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны. Бухараў па-сапраўднаму захапіўся тэмай кроватварэння ў спартсменаў у час трэніровачнага цыкла. Для таго, каб атрымаць каштоўныя вынікі, давялося правесці многія дзесяткі доследаў. І вельмі прыемна было маладому даследчыку, калі яго навуковыя працы атрымоўвалі высокую адзнаку на рэспубліканскіх аглядах-конкурсах і займалі прызавыя месцы.

Аднак студэнт нашага факультэта павінен не толькі настойліва авалодваць ведамі, займацца навукова-даследчай працай, але і павышаць сваё спартыўнае майстэрства. Інакш называць сябе студэнтам фізфака проста няёмка.

Выбраны Бухаравым від спорту, бадай, адзін з самых цяжкіх. Мікалай займаецца марафонскім бегам. І не без поспеху. Летась ён выканаў нарматыў кандыдата ў майстры спорту. Пра гэта лёгка пісаць, а вось дасягнуць такога рубяжа, ой як нялёгка! Дастаткова сказаць, што толькі для падтрымання добрай спартыўнай формы марафонцу трэба прабегчы за тыдзень прыкладна каля трохсот кіламетраў. Колькі на гэта патрэбна сіл і часу. Мікалай не шкадуе ні таго, ні другога. Ён марыць дасягнуць запаветнага рубяжа: выканаць нарматыў на атрыманне сярэбранага значка «Майстар спорту СССР». Можна з упэўненасцю сказаць, што ён дасягне сваёй мэты. Для такіх як М. Бухараў няма недаступных вяршынь.

**Г. ВЯРЫГА,**
**камсорг групы.**

